# Горадня 430 гадоў таму вачыма вандроўніка-немца

*<u>Крыніца друкавання</u>:* Гародня 430 гадоў таму вачыма вандроўніка-немца [Электронны рэсурс] / Елена Квитницкая // Harodnia.com. – 2014. – 30 ліст. – Рэжым доступу: https://harodnia.com/be/uczora/vkl-recz-paspalitaja/559-goradnya-430-gadou-tamu-vachyma-vandrounika-nemtsa. – Дата доступу: 15.06.2017.

У чэрвені 1586 года Горадню праездам па дарозе з Караляўца ў Вільню наведаў Самуэль Кіхэль, немец са Швабіі, які ў гэты час вандраваў па свеце, даехаўшы пасля аж да Турцыі. Ягоныя запісы – адна з першых успамінавых згадак пра наш горад.

Спадзяемся наведвальнікам сайта цікава будзе зірнуць на старую Горадню ягонымі вачыма і тым болей сустрэць на вуліцах горада самога Стэфана Баторыя.

"21-га чэрвеня я выехаў з адным гарадзенскім ліцвінам, купцом і гаспадаром, імя якога Ганс Гільцовіч, на ягоным возе. Ён меў уласнага рамізніка і каня. Мы сядзелі на возе толькі ўдвух, хоць ён вёз з сабою трохі закупленага сукна ды іншых тавараў. Увечары прыехалі ў вёску, званую Лагарбы, што яшчэ у Прусіі пад маркграфам. Тут ужо не гавораць па-нямецку, а па-літоўску. Яна за 9 міляў ад Караляўцу.

22-га [чэрвеня] з самай раніцы адсюль [мы] мелі добрую дорогу, бо паўсюль раўніна, было сухое надвор'е і вельмі цёпла, так што я ажно дзівіўся гарачыні. Тут галоўным чынам лясы ды зарасці, і сонца многа не пабачыш. За дзень мы праехалі 10 міляу і трапілі ў вёску Шылашах, дзе гавораць па-літоўску, гэта асобная мова пад Польской Каронай.

23-га [чэрвеня] вырушылі вельмі рана, ехалі нешта да 9 гадзінаў, пакуль ня стала горача, і мы распрэгліся ў адным паселішчы ды затрымаліся там да вечара, прыкладна да 7 гадзінаў. Таму, што мінулага дня коні часам спыняліся і не хацелі ісці, бо зусім аслабелі ад страшэннай гарачыні, а ў дадатак іх моцна кусалі вялізныя авадні і мухі. Увечары, калі гарачыня спала, мы вырушылі адтуль далей і ехалі цэлую ноч, паколькі дорога была добрая й роўная.

24-га прыкладна у 4 гадіты дня мы прыехалі ў адкрыты гарадок у Літве, што завецца Аўгустова, які ў 11 мілях ад того месца, адкуль мы выяжджалі 24-га раніцай. Тут адпачылі, з'елі абед і засталіся да вечара. Супраць ночы выправіліся адсюль у дарогу і ехалі цэлую ноч. Суцэльны лес цягнуўся 6 міляў, і нідзе не было ні хаты, ні прытулку. Але адразу за лесам з’явілася

самотная корчма, у якую мы трапілі недзе ў 2 гадзіны дня і пакармілі коняў. Адтуль давялося ехаць 4 мілі. Мы не маглі марудзіць, бо не заставалася ніякіх запасаў яды, а коням ад гарачыні зрабілася кепска. І так 25-га [чэрвеня] добрым часам прыйшлі мы ў Горадню – адкрыты горад без муроў, проста пад якім працякае рака Мемель (Нёман), што вядзе да Коўна, гораду ў Літве. Згаданай ракой можна трапіць да Караляўца. Яго вялікасць польскі кароль мае ў гэтым гарадку Горадня свой дом, які загадаў пабудаваць зусім нанова. І хоць той яшчэ не даведзены да канца, кароль тут многа спыняецца, бо мае добрую магчымасць папалявацъ. Да апошняга у яго каралеўскай вялікасці асаблівае жаданне і ахвота, так што нярэдка на працягу 8 дзён [ён] не вяртаецца у горад.



Кароль Стэфан Баторый акурат са згаданым Кіхэлем пяром чаплі ў шапцы

26-га [чэрвеня], а гэта была нядзеля, я бачыў у Горадні яго вялікасць польскага караля Стэфана, калі той ехаў на кані ад замку да храму. Гэта адметны пан між асобаў, таксама высокіх і моцных, так што сярод многіх подобных не знайсці і ня угледзець яшчэ такога. На ім адзенне, упрыгожанае згодна з мясцовымі звычаямі, і невялікая польская шапка, на якой носіць густы салтан з чорных чапліных пёраў. Калі ён так едзе, то выглядае трыюмфальна, велічна і шыкоўна. Перад ім і за ім рухаецца мноства дзяржаўных людзей, рыцараў і шляхцічаў, побач яго гвардзейцы, якія адзін ля другога стаяць па абодва бакі вуліцы ад замку да храму. Гэта ягоныя гусары і гайдукі, народ магутны і злы. [Было] відаць многа прыгожых, далікатных і элегантных коняў, з дарагім рыштункам і упрыгажэннямі. Палякі трацяць на гэта вялікія кошты. Я ўвайшоў у храм, у якім цягам цэлай гадзіны чыталі казанні па-лацінску для яго каралеўскай вялікасці. І калі кароль зноў рушыў да замку, я бачыў, як шатляндзец, актор, які знаходзіўся тут і паўсюль быў даволі добра вядомы, паехаў у другім шэрагу перад яго каралеўскай вялікасцю, а гэта мусіла значыць, што ён карыстаецца вялікай ласкай караля.



Стары Замак часоў Баторыя

27-га чэрвеня з самай раніцы король выправіўся з Горадні на паляванне, бо звычайна ён толькі ў нядзелю застаецца ў горадзе, і на той жа дзень прызначаюцца прыёмы. Гэтага дня ў часе вечаровай імшы ў адсутнасці вышэйзгаданага шатляндца ўсчаўся пажар, які дайшоў да самага замку, ці ў перадбрам’е.

Тут узнялі трывогу, і пачалася такая бегатня, што спачатку й нельга было зразумець, што там магло адбывацца. Калі я разам з іншым народам тады таксама забег у замак, дык пабачыў, што ён гарыць што агонь ужо прабіваецца праз дах ды што з-за гарачыні, дыму й чаду ніхто я можа там доўга знаходзіцца. Калі ўсё было яшчэ ў агні. Пакуль пажар тушылі і ўтаймоўвалі пераважна вадой ды рознымі ручнымі прыстасаванням, шатляндзец узлез на дах праз верх. Многія дзівіліся гэтаму: пасля таго, як дыма паменшала, шматзгадванага шатляндца ўбачылі ўверсе на даху. Калі б такі пажар ветрам занесла ў горад, то ён бы ўвесь выгараць, бо тут мала каменных дамоў, усе з дрэва збудаваныя, і дахі зусім аднолькава крытыя дранкай таксама як і дах вялікага храма. Хоць іншых храмаў я тут не глядзеў.

28-га чэрвеня увечары пасля вячэры выехаў я з Горадні з адным татарынам, які меў шкадобы вартага каня з калёсамі. Такіх татараў жыве ў краіне вельмі многа і яны пераважна рамізнікі, якія за мізэрную плату перавозяць людзей і тавары”.

Пераклад Генадзя Сагановіча